# Кніжная спадчына Уладзіслава Сыракомлі вернецца ў Беларусь

Сапраўдным падарункам для Беларусі будзе вяртанне і перадача ў дар Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі вялікай калекцыі прыжыццёвых і пасмяротных выданняў (звыш 50-і кніг) знакамітага беларускага і польскага паэта Уладзіслава Сыракомлі. Большасць з іх вельмі рэдкая і раней у Беларусі адсутнічала.

Унікальная калекцыя рарытэтаў, у ліку якіх арыгінал рэдкай фатаграфіі Уладзіслава Сыракомлі ў маладосці, была набытая ў прыватнага калекцыянера дзякуючы падтрымцы Ганаровага консула Беларусі ў Лазане Андрэя Нажэскіна і Часовага паверанага ў справах Рэспублікі Беларусь у Швейцарскай Канфедэрацыі Паўла Мацукевіча.

Больш як паўгода перад тым супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вялі перамовы аб набыцці гэтай калекцыі, была праведзеная экспертыза кожнай кнігі, праверaныя іх сапраўднасць і каштоўнасць. Ужо сёння можна казаць, што калекцыя абсалютна ўнікальная. Многія выданні захавалі арыгінальныя выдавецкія пераплёты, якія звычайна страчваюцца ў бібліятэках за доўгія гады актыўнага выкарыстання.

Урачыстая цырымонія перадачы і прадстаўленне кніжнай спадчыны Уладзіслава Сыракомлі адбудуцца сёлета.

*Паводле інфармацыі НББ*

